# Выкарыстанне лексічных і фразеалагічных адзінак у маўленні

**В. М. Астаповіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
Урыцкай СШ Гомельскага раёна

Факультатыўны курс «Развіццё маўлення» для 5—6 класаў агульнаадукацыйных устаноў прадугледжвае вырашэнне шэрагу вучэбных задач. Удасканаленне маўленча-камунікатыўных уменняў і навыкаў – адна з галоўных.

Удасканаленне ведаў па раздзеле «Лексіка. Фразеалогія» садзейнічае ўзбагачэнню слоўніка вучняў, фарміраванню граматычнага ладу, авалоданню нормамі мовы школьнікаў.

Факультатыўныя заняткі «Выкарыстанне лексічных і фразеалагічных адзінак у маўленні» даюць магчымасць паўтарыць асноўныя лексічныя і фразеалагічныя адзінкі мовы, дарэчна выкарыстоўваць іх у маўленні.

Акрамя гэтага, структура заняткаў прадугледжвае ажыццяўленне выхаваўчых задач, заснаваных на веданні асноўных правіл эканоміі прыродных рэсурсаў.

Мэтазгодна выкарыстана на занятках інтэрактыўная дошка для дэманстрацыі слайдаў «Прыродныя рэсурсы», «Эканомія вады» (этап актуалізацыі ведаў), «На марскім пабярэжжы» (здароўезберагальная паўза), «Я і вада» (этап рэфлексіі) і інш.

Тэматычны стрыжань заняткаў – дыдактычны матэрыял «Вада». Ён дазваляе адначасова паўтарыць веды пра лексічныя і фразеалагічныя адзінкі і засяродзіць увагу на неабходнасці зберажэння вады як прыроднага рэсурсу.

**Мэта:** спрыяць паглыбленню ведаў вучняў па раздзелах «Лексіка», «Фразеалогія»; стварыць умовы для дарэчнага выкарыстання ў маўленні сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў, фразеалагізмаў, перыфраз; выхоўваць паважлівыя адносіны да слова, наблізіць вучняў да ведання асноўных правіл эканоміі, выхоўваць навыкі ўмелага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Абсталяванне:** дыдактычны матэрыял, карткі для групавой работы, прэзентацыя, «экалагічныя грошы», скарбонка, буклет «Водныя рэсурсы Гомельскай вобласці».

## Ход заняткаў

**1. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

1) арганізацыйны момант;
2) знаёмства з прытчай «Парада мудраца» (дадатак 1);
3) пастаноўка праблемнага пытання: Што,на вашу думку, меў на ўвазе стары мудры чалавек?

(Мудрэц гаварыў пра зямныя, водныя і біялагічныя прыродныя рэсурсы, выкарыстанне якіх зрабіла чалавека сапраўдным царом

прыроды. А якія рэсурсы з’яўляюцца важнымі крыніцамі энергіі, неабходнай людзям ў быце, у вытворчасці, на транспарце?)

**2. Развівальна-пазнаваўчы этап**

1) праслухоўванне адказаў вучняў на праблемнае пытанне;

2) лексіка-арфаграфічная хвіліна:

абгрунтаванне арфаграм (п**р**ы**р**одн**ыя** рэсурсы: на**ф**та, кам**енн**ы **в**угал**ь**, т**о**рф, га**з**, в**ад**а, в**е**ц**е**р, дра**ў**ніна);

3) азнаямленне з задачамі заняткаў:

- выкарыстанне прыроднай энергіі стала для сучаснага чалавека нормай жыцця. Мы так прывыклі да тэлевізара і электрычнага праса, да гарачага душа і газавай пліты, да аўтамабіляў і цягнікоў, да цяпла батарэй і яркага святла люстраў, што не ўяўляем сабе іншага жыцця. Гэтае бяздумнае існаванне зрабіла многіх з нас блізарукімі людзьмі, якія не заўважаюць сваіх і чужых памылак у пытаннях карыстання энергарэсурсамі.

Давайце паспрабуем расплюшчыць вочы і зірнуць на гэты свет не праз ружовыя акуляры.

На сённяшніх занятках мы будзем рашаць задачы па эканоміі і лексікалогіі. Мы выправімся ў цікавае падарожжа па дарогах краіны Эканомія. Пройдземся па вуліцы Лексікі і Фразеалогіі. Зазірнем у палац Беражлівасці. На працягу заняткаў вы зможаце адчуць сябе гаспадарамі, таму што зможаце зарабіць у сваю скарбонку экалагічныя грошы.

4) паведамленні вучняў «Вада ў нашым доме»;

5) комплексная работа з лексічнымі і фразеалагічнымі адзінкамі:

- актывізацыя ведаў пра фразеалагізмы;

- падбор значэння да фразеалагізма (групавая работа)

| *Фразеалагізм* | *Значэнне* |
|---|---|
| 1.Грошы як **вада** | 1.Папярэджанне не прымаць паспешных дзеянняў |
| 2. **Вадой** не разліць | 2.Усё чалавеку хоць бы што |
| 3.**Ваду** ў рэшаце насіць | 3.Пра моцную дружбу |
| 4.Вывесці на чыстую **ваду** | 4.Вельмі далёкае сваяцтва |
| 5.Выйсці сухім з **вады** | 5.Схаваць сляды злачынства |
| 6.Як не ведаеш броду, то не лезь і ў **ваду** | 6.Маецца на ўвазе тая лёгкасць, з якой яны растрачваюцца |
| 7.Як з гусака **вада** | 7.Застацца беспакараным |
| 8.Шмат **вады** выбегла з тых часоў | 8.Шмат часу прайшло |
| 9.Сёмая **вада** на кісялі | 9.Займацца бескарыснай працай |
| 10.Схаваць канцы ў **ваду** | 10.Выкрыць дрэнныя справы |
| | |
| | |

- падбор да фразеалагізма аднаслоўнага адпаведніка, сіноніма,антоніма

| *Фразеалагізм* | *Аднаслоўны* | *Сінонім* | *Антонім* |
|---|---|---|---|

| | | | |
|---|---|---|---|
| | *адпаведнік* | | |
| 1.Вады ў рот набраць | Маўчаць | Не гаварыць | Гаварыць |
| 2.Цішэйшы за ваду, ніжэйшы за траву | Сціплы | Непрыкметны | Развязны |
| 3.Як рыба ў вадзе | Упэўнена | Рашуча | Няўпэўнена |
| 4.Як дзве кроплі вады | Падобныя | Аднолькавыя | Розныя |
| 5.Як у ваду апушчаны | Сумны | Невясёлы | Радасны |

**Фізкультурная паўза**

«Уявіце, што вы …»

* ляжыце на гладзі марской вады, салёная вада роўна падтрымлівае ваша цела;

*плывёце (практыкаванні рукамі);

*знаходзіцеся пад вадой; шырока расплюшчыце, а потым заплюшчыце вочы;

*знаходзіцеся пад вадой; злавіце пальчыкамі медузу.

6) растлумачыць значэнне амонімаў:

**Падводны.** 1. Які мае дачыненне да вады. *Падводнае плаванне*
2. Які мае дачыненне да падводы (воза). *Падводная аглобля*

**Гладзь.** 1. Гладкая паверхня. *Гладзь возера*
2.Спосаб вышывання. *Абрус вышыты гладдзю*

**Жлукціць**. 1. Прагна і ў вялікай колькасці піць. *Жлукціць ваду*
2.Запарваць бялізну ў кадушцы.
*Жлукціць бялізну зручна ў кадцы*

**Лейка.** 1.Сасуд у выглядзе вядра з вузкай трубкай. *Садовая лейка*
2.Разнавіднасць фотаапарата.
*Лейка—вузкаплёначны фотаапарат.*

7) актывізацыя ведаў пра паронімы праз гульню «Блытанка» (суаднесці прыметнік з назоўнікам):

| | | |
|---|---|---|
| Вадзяністы | Водны | Вадкі |
| транспарт | снег | метал |
| **?** | **?** | **?** |

8) актывізацыя ведаў пра перыфразу (падбор значэнняў да перыфраз);

Пяты акіян – ?

Чорнае золата – ?

Белае золата –?

Зялёнае багацце –?

Паўночны шоўк –?

### 3.Падагульняльны этап

– Сёння мы многа гаварылі пра слова *вада* як лексічную адзінку. А якія звесткі пра ваду, па вашым меркаванні, мы можам знайсці ў палацы Беражлівасці?

(Праслухоўванне меркаванняў вучняў.)

* Сачы, каб з крана не капала вада, калі твая сям'я не карыстаецца ёю.

* Калі мыеш посуд, кантралюй таўшчыню воднага струменя.

* Водныя працэдуры ажыццяўляй пад душам.Такім чынам ты выкарыстаеш у пяць разоў менш вады, чым прымаючы ванну.

* Падкажы бацькам, каб яны замянілі вярчальны кран на рычажны

.

* Напомні маці, што пральная машына павінна працаваць пры поўнай загрузцы.

9) растлумачце значэнне прыказак:

* Кропля малая, а па кроплі -- мора.

*Беражлівасць даражэйшая за багацце.

*Капейка рубель зберагае, а рубель галаву вартуе.

### 4. Заключнае слова

– Сёння на занятках вы ваду ў рэшаце не насілі і вады ў рот не набіралі, таму змаглі зарабіць экалагічных рублёў. А вось калі вы будзеце эканомнымі ў выкарыстанні вады, электрычнасці, цяпла, то зможаце сэканоміць сваім бацькам грашовыя сродкі і такім чынам вызваліце грошы на гасцінец для сябе!

Дадатак 1

Парада мудраца

Аднойчы да мудрага старца прыйшлі тры бедныя юнакі і папрасілі навучыць іх, як разбагацець.

«Багатым стане той з вас, хто навучыцца цаніць тое, што ў яго пад нагамі, берагчы тое, што ён бачыць вачамі, і ахоўваць тое, што чуе вушамі».

Загадкавы адказ мудраца па-рознаму быў зразуметы маладымі людзьмі, і яны пачалі спрачацца: «Трэба шукаць скарб – ён дапаможа разбагацець!»— гаварыў адзін.

«Ашчаджаць кожную зробленую капейку -- так можна збіраць багацце!»— сцвярджаў другі.

«Любавацца бляскам золата – і яно з'явіцца ў нас!»—летуценна шаптаў трэці.